# «Хвала, хвала табе, баец!»

**Па гарызанталі: 3.** «А ... Міная — // Героя Шмырова, // Застанецца вечна ў душах людзей». З верша А. Ляха «Бацька Мінай». **8.** «На сцягу тым палала ..., // Блішчэлі росы слёз». З верша П. Броўкі «Балада пра чырвоны сцяг»; 25 чэрвеня — 110 гадоў з дня нараджэння народнага паэта Беларусі. **9.** ... Галавачоў. Імя лётчыка-аса, двойчы Героя Савецкага Саюза, генерал-маёра, ураджэнца Буда-Кашалёўскага раёна Гомельскай вобласці, які за час Вялікай Айчыннай вайны здзейсніў 457 баявых вылетаў. **10.** Рашучы, імклівы рух войск на праціўніка. **13.** Сродак, зброя (перан.). **15.** У германа-скандынаўскай міфалогіі — дух прыроды. **16.** «Як у лузе, каля рэчкі. // Нізка сцелецца туман. // Па ўсім Саюзе ходзіць //... нашых партызан». Прыпеўка. **18.** Народнае эпічнае апавяданне пра герояў Вялікай Айчыннай вайны. **19.** Стрыжань, які перадае рух ад адной часткі механізма да другой. **21.** Духоўны кіраўнік у мусульман. **22.** Не пахмурна, а .... **23.** «На ўсе лады паэмы і былины//Пяюць: ..., ... табе, баец!» З верша П. Панчанкі «Франтавік». **25.** Народ і армія — ... сям'я (прык.). **27.** «Закіпела гневам, злобай // Беларуская зямля, // Паднялась магутным шквалам // Партызанская ...». З «Песні партызан» (словы і музыка народныя). **29.** «Помнім мы болі і страты свае, //... шуміць, як чароты. // О, як нам вас нестае, — // Кожны чацвёрты!». З верша А. Вярцінскага «Рэквіем па кожным чацвёртым». **31.** «... страляюць ва ўпор». Раман І. Новікава пра мінскае падполле. **32.** Сістэма знакаў для сакрэтнага пісьма. **33.** Горад на Міншчыне, малая радзіма двух родных братоў — Герояў Савецкага Саюза Яўсея і Мацвея Вайнрубаў.

**Па вертыкалі: 1.** Іван .... Прозвішча двойчы Героя Савецкага Саюза, маршала Савецкага Саюза, ураджэнца Горацкага раёна: яго імем названы вуліца ў г. Мінску і Кіеўскае вышэйшае танкавае вучылішча. **2.** «Як мы жылі, хадзілі ў ..., // За маці-Беларусь». З «Песні беларускіх партызан» (сл. П. Броўкі, муз. І. Любана). **4.** Гатунак дробных цукерак. **5.** ... Гусакоўскі. Імя двойчы Героя Савецкага Саюза, гвардыі палкоўніка, пасля вайны — генерала арміі бранятанкавых войскаў, ураджэнца Крычаўскага раёна. **6.** ... салдаты — не войска, ... дубы — не дуброва (прык.). **7.** Гарадскі пасёлак у Бабруйскім раёне, малая радзіма двойчы Героя Савецкага Саюза Сцяпана Шутава, палкоўніка, камандзіра танкавай брыгады; яго імя носяць вуліцы ў Маскве і Кіеве. **11.** «Сёння Купалка, а заўтра ..., // Пойдзем, дзявочкі, у квяточкі». З купальскай песні. **12.** Рабочая і вучэбная карабельная шлюпка. **14.** «..., ... // Адна ў Марата // І маці-Радзіма // У Марата адна». З кантаты «Памяці Марата Казея» (сл. А. Вольскага, муз. Ул. Алоўнікава). **17.** ... Антоненка. Імя лётчыка-знішчальніка, ураджэнца Слаўгарадскага раёна, які першы сярод ураджэнцаў Беларусі ў Вялікую Айчынную вайну быў узнагароджаны высокім званнем Героя Савецкага Саюза; загінуў у ліпені 1941 года. **20.** Спецыяльныя прыборы. **23.** «Неба ўсё пакрылі ..., // Падымаецца туман. // Сабіраюцца атрады // Беларускіх партызан». Прыпеўка. **24.** Шостая нота музычнай гамы. **25.** Імклівы напад войскаў на праціўніка. **26.** Цвёрдая набойка на падэшве пад пятой. **27.** Часціца ўказальная: ужываецца для ўзмацнення эмацыянальнай афарбоўкі сказа. 28. Добрым людзям — ..., а шаленцам — галавою ў вір (прык.). **30.** «Канстанцін Заслонаў — наша слава, // Беларусі — партызанскі ...». З «Песні пра Заслонава» (сл. А. Астрэйкі, муз. Ул. Алоўнікава).

**Склаў Лявон ЦЕЛЕШ.** *г. Дзяржынск.*



**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ПАСКА, АДКАЗЫ:**

**Па гарызанталі: 3.** Поўдзень. **8.** Кроў. **9.** Павен. **10.** Імла. **21.** Імам. **22.** Ясна. **23.** Хвала. **25.** Адна. **27.** Вайна. **29.** Памяць. **31.** Рубіні. **32.** Шыфр. **33.** Барысаў. **Наўлск. 13.** Орган. **15.** Эльф. **16.** Слава. **18.** Сказ. **19.** Атака. **26.** Абшас. **27.** Во. **28.** Мір. **30.** Сын.

**Па вертыкалі: 1.** Якубоўскі. **2.** Бой. **4.** Дражэ. **5.** Іосіф. **6.** Два. **7.** Гушча. **11.** Ян. **12.** Ян. **14.** Граната. **17.** Анікеєв. **20.** Анартура. **23.** Хмары. **24.** Ян. **25.** Ніна. **26.** Абшас. **27.** Во. **28.** Мір. **30.** Сын.

# НА СЛУЖБЕ Ў АЙЧЫНЫ

**У Саюзе пісьменнікаў Беларусі падведзены вынікі рэспубліканскага конкурсу на найлепшы твор, які праводзіўся адразу да двух юбілеяў — 70-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і 70-годдзя Вялікай Перамогі. Днямі адбылося ўзнагароджванне пераможцаў.**

Дыпломы і самыя розныя адзнакі атрымалі лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь Алесь Савіцкі, акадэмік Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Уладзімір Гніламёдаў, доктар філалагічных навук Іван Саверчанка, паэты, празаікі, публіцысты Галіна Нічыпаровіч, Тамара Краснова-Гусачэнка, Алесь Марціновіч, Мікалай Смірноў, Яўген Кашукоў, ды шмат хто яшчэ. Узнагароджванне праходзіла ў мемарыяльнай зале Дома літаратара, дзе наведвальнікаў, удзельнікаў любой сустрэчы сустракаюць фатаграфічныя выявы франтавікоў, партызан і падпольшчыкаў з шэрагаў пісьменнікаў Беларусі. Менавіта ў гэтай зале Саюз пісьменнікаў ладзіць урокі мужнасці, запрашае сюды для размовы літаратурную моладзь.

Уручаючы дыпломы і памятныя падарункі, старшыня СП Беларусі Мікалай Чаргінец выказаў словы падзякі музейным і бібліятэчным работнікам, якія шмат зрабілі і працягваюць рабіць для прапаганды гераіка-патрыятычнай тэмы ў беларускай літаратуры.

**Сяргей ШЫЧКО.**

## Даты | Падзеі | Людзі

### 4 ЛІПЕНЯ



**1790** год — нарадзіўся Джордж Эверэст, брытанскі геадэзіст. Выканаў тапаграфічную здымку тэрыторыі Індыі і першым вызначыў самай высокай вяршыні свету — Джамалунгмы, якая і была названа Эверэстам.

**1810** год — у Магілёўскай губерні нарадзіўся Дзмітрый Пятровіч Жураўскі, эканаміст, статыстык. З 1831 года працаваў у камісіі М. Сперанскага па складанні збору законаў Расійскай імперыі. У пытаннях палітэканоміі набліжаўся да паняцця тэорыі працоўнага і прыбавачнага кошту. Прычыну ўсіх бедаў народа бачыў у існуючых вытворчых адносінах, у размеркаванні прыватнай уласнасці па класах, адкуль вынікала, што галоўным тормазам развіцця прадукцыйных сіл Расіі з'яўляецца прыгоннае права. Прагрэсіўныя палітэканамічныя ідэі Жураўскага абумовілі правільны метадалагічны падыход да статыстычных даследаванняў, а яго працы аказалі вялікі ўплыў на ўсё далейшае развіццё эканамічнай навукі ў Расіі.

**1920** год — у ходзе савецка-польскай вайны пачалася ліпеньская аперацыя войскаў Заходняга фронту, у выніку якой да 1 жніўня ад польскіх войскаў была вызвалена амаль уся тэрыторыя Беларусі.

### Было сказана

**Андрэй ВОЛЯН, палітычны дзеяч, філосаф, ідэолаг Рэфармацыі:**

*«Нікчэмны той, хто бачыць, як нехта чужы дае яго жонцы тое, чаго не даў ён сам».*

■ І мы там былі

# На берагах венецыянскіх каналаў — будучыня ўсяго свету

**Найбуйнейшы мастацкі форум у свеце — Венецыянская біенале — бярэ свой пачатак аж з 1895 года. З таго часу шмат вады змянілася ў легендарнай лагуне, ды і сусветнае мастацтва сёння мала чым нагадвае колішні акадэмізм ці мадэрн.**

У першыя майскія дні ў Венецыі распачалася 56-я па ліку прэзентацыя шматлікіх мастацкіх навінак з большасці краін свету, якая працягнецца да кастрычніка. Відавочнага лідарства сёлета тут няма. Мова еўрапейскага мастацтва мала чым адрозніваецца ад творчых эксперыментаў краін Азіі ды Афрыкі. Нацыянальныя экспазіцыі размешчаны па розных выставачных памяшканнях у былым арсенале, пакгаўзах, паркавых павільёнах... Каб ахапіць позіркам усе творчыя навацыі, неабходна вызначыць для сябе сапраўдны доследны маршрут, прыхапіць з сабой даведнікі ды буклеты і вандраваць пешкі і на водна-аўтамабільным транспарце не адзін кіламетр. Але такія намаганні сябе апраўдваюць.

Венецыя. Падчас біенале тут асабліва шматлюдна.

«Дзве архідэі» Ізы Генцкен.

Становіцца відавочным, што «Будучыня ўсяго свету» (так гучыць дэвіз сёлетняй экспазіцыі — All the world's futures) не можа існаваць без вобразных спадзяванняў і ўяўленняў мастакоў-наватараў розных краін.

Сродкі выразнасці ў сучасным мастацтве павінны рэагаваць на праявы сучаснага жыцця не толькі аператыўна, але і... парадаксальна, таму ў кожным павільёне гледачоў чакае нешта непрадбачанае і не заўсёды лёгкае для разумення. Паўсюль шмат відэаінсталяцый, фотаэкспазіцый, мудрагелістых нефункцыянальных канструкцый з металу і сілікону. І не хапае звыклага для беларускіх аматараў мастацтва жывапісу...

У самім беларускім павільёне экспануюцца на віртуальным экране архіўныя фотаматэрыялы, прысвечаныя ваеннай гісторыі, падрыхтаваныя вядомым скульптарам Канстанцінам Селіханавым. Ваенная праблематыка прысутнічае і ва ўкраінскіх экспазіцыянераў. У іншых мастацкіх павільёнах больш актуалізавана ідэя інтэграцыі, вяртання да вытокаў цывілізацый. Напрыклад, італьянскія мастакі стварылі выставачны тандэм з творцамі Лацінскай Амерыкі, дзе дамінуюць першабытныя татэмічныя адлюстраванні, а амерыканскія аўтары паспрабавалі прыгадаць традыцыі фотарэалістычнага жывапісу 1970-х гг.

Своеасаблівымі дамінантамі гэтага форуму творчых ідэй сталі буйнамаштабныя кампазіцыі з металу «Дзве архідэі» Ізы Генцкен (Германія) і «Феніксы» Сю Бінга (КНР). Падобна, у наш час будучыня бачыцца... праз прызму звароту да міфалагічных архетыпаў, набліжэння да прыродных формаў. У гэтым сэнсе нашым айчынным мастакам ёсць што ўзяць са скарбонкі нацыянальных традыцый. У тым ліку і жаданне ініцыяваць правядзенне міжнародных творчых форумаў у сябе на радзіме, якая зараз у свеце набывае прызнанне як цэнтр мірных пагадненняў і талерантнасці.

**Тамара ФАМЕНКА. Фота аўтара.**

*Венецыя — Мінск.*

# ГАРАСКОП СТРЫЖАК НА ЛІПЕНЬ

**4 ліпеня, *субота.*** На календары неспрыяльны дзень для стрыжкі валасоў.

**5 ліпеня, *нядзеля.*** Яшчэ адзін неспрыяльны дзень — стрыжка можа парушыць энергетычны баланс, а таксама справакаваць праблемы са здароўем, істотны заняпад сіл і дэпрэсію.

**6 ліпеня, *панядзелак.*** Сёння не дзень для наведвання цырульніка — стрыжка негатыўна адаб'ецца на структуры валасоў і на вашай уласнай самаацэнцы.

**7 ліпеня, *аўторак.*** Неспрыяльны час для стрыжкі і афарбоўвання валасоў.

**8 ліпеня, *серада.*** Неспрыяльны дзень для стрыжкі валасоў, але добры для правядзення эпіляцыі.

**9 ліпеня, *чацвер.*** Сёння неспрыяльны дзень для стрыжкі валасоў.

**10 ліпеня, *пятніца.*** Афарбуйце сёння валасы ў свой натуральны колер — гэтым вы прыцягне да сябе «патрэбных» людзей.

**11 ліпеня, *субота.*** Зробленая сёння прычоска здольная ўзмацніць харызму яе ўладальніка, актывізуе яго асабістую энергетыку, напоўніць лёгкія дабратворным паветрам, а душу аптымізмам і верай ва ўласную ўдачу.

**12 ліпеня, *нядзеля.*** Стрыжка будзе ўдалай, асабліва захапляльным атрымаецца вобраз з лёгкай і паветранай прычоскай.

**13 ліпеня, *панядзелак.*** У гэты дзень добра рабіць лёгкія паветраныя прычоскі. Стрыжка ніяк не паўплывае на стан валасоў.

**14 ліпеня, *аўторак.*** Пасля стрыжкі ў дні Рака прычоска абсалютна не трымае форму, валасы становяцца непаслухмянымі, не паддаюцца ўкладцы.

**15 ліпеня, *серада.*** Устрымайцеся ад стрыжкі, могуць здарыцца непрыемнасці са здароўем.

**16 ліпеня, *чацвер.*** Выдатны дзень для стрыжкі і афарбоўвання валасоў. Маладзік — гэта той дзень, калі задуманыя жаданні спраўджваюцца. Можна памарыць, каб вашы валасы былі заўсёды прыгожымі.

**17 ліпеня, *пятніца.*** Выдатны дзень для наведвання цырульніцкага салона. Фарба для валасоў ляжа роўна, яе колер доўга не паблякне, а стрыжка зробіць вас больш рашучымі.

**18 ліпеня, *субота.*** Спрыяльны дзень для наведвання салона. У гэты перыяд паляпшаецца структура і паскараецца рост валасоў.

**19 ліпеня, *нядзеля.*** Дзень цудоўна падыходзіць для наведвання цырульніка.

**20 ліпеня, *панядзелак.*** Добры дзень для стрыжкі, яна ў такія дні робіць валасы прыгожымі, пышнымі і шаўкавістымі.

**21 ліпеня, *аўторак.*** Дзень выдатна падыходзіць для стрыжкі, больш за тое, стрыжка дапаможа прыцягнуць у жыццё каханне, новыя перспектыўныя знаёмствы і яркія ўражанні.

**22 ліпеня, *серада.*** Пасля стрыжкі ў гэты дзень валасы растуць даволі хутка, але іх якасць і структура не мяняюцца.

**23 ліпеня, *чацвер.*** Сёння сатанінскія 9 месяцовыя суткі, стрыгчы валасы і афарбоўваць іх не рэкамендуецца.

**24 ліпеня, *пятніца.*** Па тыбецкіх традыцыях гэта дзень, які спальвае. Рэкамендуецца ўстрымацца ад стрыжкі, бо гэта прыцягне да вас хваробы.

**25 ліпеня, *субота.*** Вельмі непажаданы дзень для стрыжкі, вас замучаюць недахопы ўласнай натуры. Пастаянна будзе здавацца, што вы недасканалыя, што будзе вельмі цяжка дасягнуць чагосьці такога, што магло б дапамагчы прасунуцца наперад.

**26 ліпеня, *нядзеля.*** У выніку стрыжкі валасоў узрасце прывабнасць, вы будзеце падабацца людзям.

**27 ліпеня, *панядзелак.*** Стрыжка валасоў прынясе шчасце і ўпэўненасць у сабе.

**28 ліпеня, *аўторак.*** Добра стрыгчы валасы тым, у каго аслабленае фізічнае здароўе і каму надакучыла манатоннасць у жыцці, каму не хапае актыўнасці, смеласці і валявых якасцяў.

**29 ліпеня, *серада.*** Спрыяльны дзень для стрыжкі і афарбоўвання валасоў. Стрыжка прыцягне шчасце, палепшыць знешні выгляд.

**30 ліпеня, *чацвер.*** Спрыяльны дзень для візіту ў салон. Аднак пры гэтым не варта эксперыментаваць і рэзка мяняць звыклы для вас вобраз.

**31 ліпеня, *пятніца.*** Калі ў гэты дзень састрыгчы канцы валасоў, то тым самым можна зняць лішні груз, непатрэбную інфармацыю. Валасы ажывуць, амалодзяцца, стануць гусцейшымі, будуць менш выпадаць.

## Азбука народнай культуры

ад Янкі Крука і Аксаны Катовіч

ГАРОХ. Калісьці гэтая культура з'яўлялася адной з галоўных страў усходніх славян. Сімволіка пладаноснасці і ўраджайнасці гароху дае магчымасць зразумець, чаму славяне вельмі часта выкарыстоўвалі яго ў сямейных абрадах. У песнях гарох звалі золатам. У казках гарохавая сцябліна расце да неба, а тых, хто здолее па ёй узлезці, чакае незлічонае багацце. Цара гэтага царства звалі Гарохавым.

◈ У шматлікіх народных песнях, тлумачэннях сноў гарох атаясамліваецца са слёзамі. Менавіта таму рассыпаны гарох прадказваў бяду і няшчасце.

◈ Для забеспячэння дабрабыту і багацця на працягу новага года ў славян гарох быў абавязковай ежай на Каляды. У гэтыя святочныя дні ў хлеб запякалі некалькі гарошын. Лічылася, каму трапіць луста хлеба з гарохам, той будзе шчаслівым і багатым увесь год.

◈ На Каляды гарохам «закармлівалі» курэй, лічылася, што птушка знясе столькі яек, колькі гарошын з'есць у гэты час; гарохам абсыпалі вуллі і сад, каб забяспечыць пладаноснасць і ўраджай.

◈ Каб увесь год быць з грашыма, трэба было перад каляднай вячэрай кінуць лыжку недаваранага гароху ў кут. У некаторых рэгіёнах з гэтай мэтай гарох закопвалі ў зямлю там, дзе з даху капае вада, г.зн. з паўднёвага боку.

◈ У свята, прысвечанае татэмнай жывёле — мядзведзю, варылі гарох і рабілі з яго «камы». Гэты дзень атрымаў назву Камаедзіца (6 красавіка).

◈ Пасля вянчання нявесту абсыпалі гарохам. А па колькасці гарошын, якія застануцца ў адзенні, прадказвалі колькасць будучых дзяцей.

◈ Вянок з гарохавай саломы сімвалізаваў страчаную цнатлівасць, цяжарнасць па-за шлюбам.

◈ Тым кавалерам, якім дзяўчаты адмовілі, вешалі на дзверы ці на воз вянок з гарохавай саломы.

◈ Гарох прысутнічае і ў пахавальнай абраднасці. На Раство гаспадар раскідваў гарох для душ памерлых, глядзеў у бок могілак і клікаў бацькоў на пачастунак. Для палягчэння агоніі пад галаву чалавеку, які канае, клалі гарохавую салому. Часам куццю на жалобны стол рыхтавалі з гароху.

◈ Прыкмячалі: «Калі алешына ў час цвету дае шмат каташкоў, то будзе шмат гароху».

**Мікалая ЛІТВІНАВА**

віншуем з нараджэннем сына!

*Зычым новаму грамадзяніну Беларусі,*
*які з'явіўся на свет у такое вялікае свята,*
*заўсёды крочыць па жыцці пераможцам,*
*а яго бацькам — здароўя, кахання і дабрабыту!*

**Звяздоўцы.**

Утерянный студенческий билет № 6159 УО «БГАИ» на имя ЛЕОНКОВОЙ Юлии Олеговны **считать недействительным.**

**06 августа 2015 г. в 15.30 по адресу: ул. Промышленная, 11 состоится общее собрание акционеров ЗАО «СМУ-77».**

# СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск | 4.44 | 21.43 | 16.59 |
| Віцебск | 4.25 | 21.41 | 17.16 |
| Магілёў | 4.34 | 21.34 | 17.00 |
| Гомель | 4.40 | 21.27 | 16.41 |
| Гродна | 5.01 | 21.57 | 16.56 |
| Брэст | 5.11 | 21.48 | 16.37 |

**Месяц**

*Поўня 2 ліпеня.*
*Месяц у сузор'і Вадалея.*

**Імяніны**

***Пр.*** *Георгія, Максіма, Паўла, Юльяна.*
***К.*** *Альжбеты, Андрэя.*

Фота Алены ДАРАШКЕВІЧ.

# ЗАЎТРА




## ...у суседзяў

| | | |
|---|---|---|
| ВАРШАВА +30..+32°С | КІЕЎ +27..+29°С | РЫГА +24..+26°С |
| ВІЛЬНЮС +27..+28°С | МАСКВА +24..+26°С | С.-ПЕЦЯРБУРГ +17..+19°С |

## УСМІХНЕМСЯ

У вёсцы бацькі заўсёды ведаюць, у колькі прыйшла дадому дачка, таму што на трактары ціха да хаты не пад'едзеш.

**Я прагаладаўся і адкрыў піва. Гатаваць не так ужо і складана, не ведаю, чаго там бабы скардзяцца.**

Сустракаюцца два прадпрымальнікі.
— Як справы? Як бізнес?
— Што табе сказаць? Не так добра, як мне б хацелася, але і не так ужо дрэнна, як хацелася б табе.

**Пайшоў пяты год. Жонка і сёння думае, што гэта кот цягне брудныя шкарпэткі пад канапу.**

**Спёка ў заапарку**

carcatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, 287 17 21, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by; e-mail: info@zvyazda.minsk.by, (для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значкам, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень. Тыраж 20.092. Індэкс 63850. Зак. № 2521.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 3 ліпеня 2015 года.